Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 20 (365) | Пятніца, 15 мая 1959 года | Цана 20 кап.

СЁННЯ У НУМАРЫ:

1. У блакіт узнімаюцца... 1, 2, 4 стр.
2. Студэнцкае лета 2 стр.
3. Калейдаскоп 2—3 стр.
4. П'ер Кюры 4 стр.
5. Канферэнцыя СНТ 3 стр.
6. Сакрэт біёлагаў. 3 стр.
7. Піянерважатая 3 стр.
8. Джазавае кацянё (фельетон) 4 стр.
9. Мяч над сеткай 4 стр.
10. У студэнцкіх інтэрнатах 4 стр.

НА ПАРАДКУ ДНЯ—СЕСІЯ

Па аб'явах, якіх нямала вывешваюць на факультэтах, можна меркаваць, чым жыве універсітэт, аб яго будняхі і святах. Сёння аб'явы газвораць аб прыходзе перадсесійнай пары. На стэндах графікі аглядных лекцый, кансультацый, залікаў і экзаменаў. У дзвярах аўдыторый—групы здаючых. Адны гаманлівыя і мітуслівыя, гэта—першакурснікі. Другія ідуць сябе больш паважна, спакойна. Адразу відаць — студэнты старэйшых курсаў.

Але, як адна ластаўка яшчэ не дае вясны, так і першыя залікі—гэта яшчэ не напружаная пара сесіі. Аб'явы аб экзаменах патанаюць у масе звестак аб вечарах, сустрэчах, рэпетыцыях, аб забытых кімсьці і кімсьці знойдзеных пальчатках і аўтаручках. Кабінеты яшчэ пустуюць. «Свабоднае месца» ў чытальнай залі — пакуль што не праблема. Нібы загаварыўшыся, маўчаць пра сесію насценныя газеты. І на пальцах пералічыш курсы і факультэты, дзе ўжо адбыліся сходы, прысвечаныя гэтаму адказнаму перыяду.

А вясенняя экзаменацыйная сесія настойліва і гучна стукаецца ў дзверы. Каляндар, нібы маятнік гадзінніка, няўмольна адлічвае дні, што засталіся да яе пачатку. Пятнаццаць, чатырнаццаць, трынаццаць... Хімікі, біёлагі ўжо здалі першыя экзамены. На чарзе— географы-трэцякурснікі, якія ў чэрвені выязджаюць на практыку.

Таму пытанні сесіі—на парадак дня! На стэндах аб'яў і ў насценным друку сесію—на цэнтральнае месца! На сходах і пасяджэннях першая размова—аб сесіі! Каб кожны студэнт ведаў, што, калі і ў якім аб'ёме ён здае, дзе і якую літаратуру можа атрымаць, куды і ў які час прыйсці на кансультацыю.

Ад экзаменатараў мы хочам — больш патрабавальнасці і прынцыповасці, менш прыдзірлівасці і лібералізма. Ад партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх камітэтаў, дэканаў і кафедраў—строгага кантролю за нармальным ходам экзаменаў і залікаў. Кожнаму з факультэтаў — патрэбны план мерапрыемстваў на ўвесь перыяд сесіі!

Вясенняя экзаменацыйная сесія—праверка якасці работы ўсяго універсітэцкага калектыву. Як рабочы ля станка, калгаснік ў полі, вучоны ў лабараторыі, так студэнт ля экзаменацыйнага стала бярэ чарговы рубеж сямігодкі. Сесія—наша справаздача аб рабоце ў першым годзе сямігодкі. А таму яшчэ і яшчэ раз: пытанні сесіі, узорнай падрыхтоўкі да яе і паспяховай здачы—на парадак дня!

З надыходам вясны і набліжэннем сесіі ўсё больш студэнтаў імкнуцца перанесці заняткі з цесных аўдыторый на свежае паветра. Наш фотакарэспандэнт быў сведкай адной такой «паветранай» кансультацыі ва універсітэцкім скверы.

Па універсітэту

ФОТАРЭПАРТАЖ

У БЛАКІТ УЗНІМАЮЦЦА...

Паглядзіце на гэты здымак. Высока над зямлёй у сінім небе праплываюць цесляры. Растуць рыштаванні і, здаецца, імкнуцца дагнаць і перарасці высачэзны вежавы кран, на кончыку стралы якога палымнее чырвоны сцяжок.

Гэта цесляр Іосіф Капанец (у цэнтры); дэмабілізаваны марак Аркадзь Казлоўскі, які яшчэ ніяк не можа развітацца з матроскай цяльняшкай і пра ўсмешку якога сябры гавораць, што яна сонечная; і адзін з вопытнейшых цесляроў брыгады Скадорава Іван Кручонак. А наогул усе хлопцы ў гэтай брыгадзе падабраліся дружныя, працавітыя. 147 працэнтаў плана—вось вынік месячнай працы цесляроў Скадорава. Майструюць яны сёння прагоны над калонамі, што падтрымліваюць кесонныя перакрыцці, і звонкія перастукі іх тапароў часам перакрываюць шыпенне электразваркі, праразлівыя гудкі вежавых кранаў, ад якіх уздрыгвае навічок упершыню трапіўшы на будоўлю...

Працяг на стр. 2).

Свята Перамогі

9 мая адзначылі студэнты і выкладчыкі свята Перамогі над фашысцкай Германіяй. Гэтаму слаўнаму дню было прысвечана ўрачыстае пасяджэнне ў актавай зале корпуса гуманітарных факультэтаў. Да студэнтаў у госці прыехалі воіны адной з воінскіх часцей, з якой ужо многа год падтрымліваюцца сяброўскія сувязі.

Тав. Петрыкаў ад імя парткома і рэктарата шчыра павіншаваў студэнтаў, выкладчыкаў і гасцей з вялікім святам. Перад сабраўшыміся выступілі ўдзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны А. В. Кірсанаў, воіны: Цвяткоў, Паўшанка, Букін, Васільеў.

Ад імя студэнтаў гасцей прывітала і павіншавала студэнка IV курса фізічнага факультэта Н. Песенька. У заключэнне быў дан вялікі канцэрт, у якім прынялі ўдзел і госці.

Студэнты на будоўлях

Нядаўна студэнты II курса беларускага аддзялення філфака працавалі на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта.

Асаблівай стараннасцю выдзяляліся студэнткі Тамара Жук, Маргарыта Барысевіч, Галя Лябёдка і Марыя Ванагель. Яны паказвалі прыклад у працы ўсім іншым студэнтам і атрымалі добры водзыў кіраўнікоў будоўлі.

Л. БАРЫСЕВІЧ,
студэнтка II курса філалагічнага факультэта.

НАШ АКТЫВІСТ

Так называюць Нону Рабцэвіч усе студэнты 2 курса матэматычнага факультэта. І гэта заслужана. Н. Рабцэвіч з'яўляецца членам камсамольскага бюро другога курса. Арганізацыя мастацкай самадзейнасці, правядзенне вечароў, спартыўных мерапрыемстваў—усё гэта не абыходзіцца без яе актыўнага ўдзелу. Нона таксама займаецца ў секцыі фехтавання. Ездзіла яна працаваць і па цаліну.

І вучыцца Рабцэвіч добра. На курсе яе ведаюць як шчырага, чулага таварыша.

Зіна МАРУК,
студэнтка 2 курса матфака.

ЛЕПШАЯ Ў ІНТЭРНАЦЕ

Добрая слава ідзе аб 16-м пакоі інтэрната фізікаў і матэматыкаў. Тут жывуць студэнткі першага курса фізічнага і матэматычнага факультэтаў Урбановіч, Заленская і іншыя. Усяго іх дзесяць чалавек. Але жывуць яны дружна. У пакоі ў іх заўсёды чыста, утульна. Старасты Іра Анасовіч і Соня Рыбалка строга сочаць за парадкам.

У час агляду, які праводзіўся студсаветам інтэрната, гэты пакой заняў першае месца і прэміраваны прыёмнікам.

І. АНАНЬЕВА, студэнтка I курса фізфака.

НА ЗДЫМКУ: выпускніца гістфака Э. Маковіч на абароне сваёй дыпломнай. Дзяржаўная камісія ацаніла яе работу на «выдатна».

Фота А. МІХАЙЛАВА.

У БЛАКІТ УЗНІМАЮЦЦА...

(Працяг. Пачатак на стр. 1)

Хораша працаваць ім у вышыні, у сінім блакіце...

Будуецца, расце галоўны корпус нашага універсітэта. З кожным днём у блакітную высь узнімаюцца яго будучыя паверхі, якія пакуль што—сукупнасць цэглы, жалезабетонных блокаў, рознай арматуры і рыштаванняў. Але гэта будоўля для некаторых з'яўляецца і своеасаблівым універсітэтам. Вось кранаўшчык Іван Багінскі. Тут ён, на нашай будоўлі, праходзіць практыку пад кіраўніцтвам майстра сваёй справы Сяргея Зінкевіча. Пільна сочыць Ваня, як падуладны яго руцэ плыве ў паветры цяжкі кантэйнер, як нецярпліва разгружаюць яго рабочыя комплекснай брыгады Генадзя Лаўрыновіча, брыгады, амаль кожны член якой валодае некалькімі сумежнымі прафесіямі. Таму і працуюць яны выдатна, і іх брыгада па праву лічыцца лепшай на будоўлі.

Не было яшчэ выпадку, каб сябры Лаўрыновіча выканалі месячную норму менш, чым на сто сорак працэнтаў. І нікому, нікому не уступаюць яны першынства ў сацыялістычным спаборніцтве.

(Заканчэнне на стр. 4).

У нас у танцавальным

Увагу старонняга чалавека прыцягвае вясёлая заўзятая мелодыя беларускага народнага танца «Лявоніха», і праходзячыя па калідоры не могуць стрымацца, каб не паглядзець у аўдыторыю № 30 біякорпуса, дзе праходзяць рэпетыцыі танцавальнага калектыву.

Некаторыя нашы студэнты, асабліва тыя, што прыбылі ва універсітэт пасля вытворчасці ці службы ў арміі, гавораць, што, нібы, яны старыя для танцаў. Яны глыбока памыляюцца. У нашым калектыве займаюцца студэнты ва ўзросце 25 гадоў і больш і не адчуваюць сябе стомленымі і адстаючымі ад больш маладых.

Пеця Шпак, студэнт II курса гістфака, прышоў ва універсітэт пасля службы ў радах Васпна-Марскога Флоту. Да гэтага на сцэне ніколі не выступаў. У першы дзень заняткаў ён з цяжкасцю дабіваўся выканання прасцейшых элементаў, а цяпер ён амаль без памылак танцуе «Лявоніху» ад пачатку да канца. І не дзіўна: Пеця не прапусціў ніводнай рэпетыцыі. І вучыцца ён на выдатна. Да пары Пеці і яго аднакурснікі Света Сіманькова і Аркадзь Равека, Віктар Акульчык і Люда Сташонак (III курс геафака), першакурснікі Пеця Якубовіч (юрфак) і Ніна Давыдоўская (фізфак), Лена Рахуба (II курс філфака) і інш.

Чакаем вашага прыходу, таварышы студэнты, у наш малады калектыў.

П. ВАЎКАВЕЦ, студэнт II курса філалагічнага факультэта, удзельнік танцавальнага гуртка.

СТУДЭНЦКАЕ ЛЕТА

На днях адбылося сумеснае пасяджэнне камітэта камсамола і прафкома. Абмяркоўвалася важнае пытанне аб працы і адпачынку студэнтаў у перыяд летніх канікул.

Цікавым будзе студэнцкае лета. Многія нашы таварышы, атрымаюць пуцёўкі ў дамы адпачынку і санаторыі, іншыя правядуць свой вольны час у турысцкіх паходах па Каўказу, наведаюць Маскву, Ленінград, Сочы, Ялту. Будуць створаны ўсе ўмовы для цікавага адпачынку студэнтаў у спартыўна-аздараўленчым лагеры нашага універсітэта.

У адным з маляўнічых куткоў Мінскай вобласці ствараецца працоўны студэнцкі лагер. Многім пражстаўляецца магчымасць папрацаваць і адпачыць у гэтым лагеры. Жадаючыя сумясціць працу і адпачынак павінны падаць заяву ў камітэт камсамола.

Справай гонару ўсіх студэнтаў нашага універсітэта з'яўляецца ўдзел у грамадска-карыснай працы. Жыхары горада Мінска і другіх буйных гарадоў рэспублікі павінны будуць адпрацаваць на будаўніцтве свайго універсітэта 48 гадзін. Іншагароднім будзе прадастаўлена магчымасць працаваць адразу пасля здачы летняй экзаменацыйнай сесіі, каб не прыходзілася летам дзеля гэтага прыязджаць у Мінск. Для кіраўніцтва работай створан штаб, які ўзначаліў студэнт юрыдычнага факультэта, член бюро камітэта камсамола Леанід Кенда.

Той, хто паедзе на летнія канікулы ў сельскую мясцовасць, павінен будзе выпрацаваць у родным калгасе 15 працадзён, у саўгасе—15 дзённых норм і па прыездзе на заняткі на наступны вучэбны год да 10 верасня павінен будзе здаць камсоргу курса даведку аб выкананай рабоце.

Камсоргі курсаў павінны склаці ў найкарацейшы тэрмін спісы студэнтаў, у якіх павінна быць указана, дзе намераны праводзіць свае летнія канікулы навучэнец нашага універсітэта, якую прапагандысцкую работу сярод насельніцтва хоча правесці. Кожнаму будзе ўручана камсамольская пуцёўка з заданнем прачытаць лекцыю або выпусціць на сценгазету ці правесці гутарку.

На аснове спіскаў камітэтам камсамола будуць адпраўлены пісьмы ў адпаведныя сельскія раёны камсамола з просьбай магчы нашым студэнтам у арганізацыі працы, а таксама пракантраляваць праводзімую імі работу з тым, каб ва універсітэце ведалі як аб добрых, так і аб дрэнных справах камсамольца нашай вузаўскай арганізацыі.

І. СТАРАВОЙТАЎ, намеснік сакратара камітэта камсамола па палітыка-масавай рабоце.

НА ЗДЫМКУ: у ленпакоі інтэрната па вуліцы Кірава заўсёды ўтульна, чыста і ціха. Тут можна і адпачыць, і падрыхтавацца да чарговых заняткаў.

КАЛЕЙДАСКОП

На конкурс

ГУМАРЭСКА

— Сеня, а здорава сказаў адзін паэт: «Я б хацеў забыцца і заснуць!» Як гэта сёння было б мне дарэчы,—праціраючы кулаком вочы, пацягваючыся і пазяхаючы, сказаў Жэня. Нарэшце, ён падняўся, працягнуў руку к чайніку і, адкінуўшы галаву назад, направіў горлышка ў рот.

— І зноў вады няма? Хто дзяжурны?—загаманіў Жэня. Ён са злосцю кінуў чайнік, нахаду таўхануў босаю нагою крэсла, што стаяла наміж сталом і ложкам, і, прыжмурыўшы вочы, уставіўся ў «графік дзяжурства». Тут ён супакоіўся і ціха прамармытаў сабе пад нос:

— Учора, здаецца, падлогу мыў. Ложак засцілаць няварта—заўтра змена бялізны.

— Менш разважай, гуляка, ды хутчэй збірайся. Спознімся. Пачатак а дзесятай,—падганяў Сеня свайго таварыша. Сеня нагнуўся і падняў раскрыты падручнік.

— Ну, як? Напэўна, вызубрыў усё?—запытаў ён у Жэні.

— Не-е-е. Я здзіўляюся, навошта людзі так тоўста пішуць. Калі б у падручніку было 140 старонак, мне б не давялося сёння ісці на авось,—сказаў Жэня, пільна разглядаючы ў люстэрка трохі падпухшыя, але ўсё ж прыгожыя сінія вочы, кучаравыя мяккія валасы і далікатны дзявочы твар.

— Сіла,—шчоўкнуўшы пальцамі, сказаў ён, хоць цяжка было зразумець, у чым «сіла» ці ў тым, што ён быў задаволены сам сабою, ці ў кінутай рэпліцы, ці яшчэ ў чым. І, крыху намаўчаўшы, дадаў:

— Эх, дзяўчаты, дзяўчаты-ы-ы! На дарозе я табе раскажу, як назаўчора, у нядзелю...

Але Жэня свайго слова не стрымаў. Усю дарогу ён больш маўчаў. Галава ў яго была цяжкая, нібы волавам налітая. Балюча сціскала грудзі. Сэрца моцна білася і замірала перад невядомасцю. Што яго чакае сёння?

Распранаючыся ля вешалкі. Жэня паскардзіўся:

—Цемната. Што ведаў і тое забыў.

—Трымайся! Цяпер у тваёй галаве туман. Прыдзеш на экзамен—туман рассеецца і застанецца... пустата, — пажартаваў Сеня. Гэты жарт за жывое крануў Жэню. Сябе ён лічыў здольным і думаў, што ведае не менш за іншых, хоць нічога не вучыў. А калі б ён сеў за падручнікі, як некаторыя, дык, бясспрэчна, быў бы выдатнікам. Жэня думаў, думаў і ніяк не мог прыдумаць, чым бы такім трапным адказаць на шпільку сябра, каб не застацца ў даўгу і рэабілітаваць сябе. Нічога лепшага ён так і не прыдумаў, як толькі:

— Не-е-е. Я ж вучу: Усю ноч... Сам бачыў.

Сеня і Жэня падышлі да аўдыторыі. Аднакурснікі шчыльна абступілі чарговага шчасліўца. З усіх бакоў на яго сыпаліся пытанні. Задаволены і ўзрушаны, ён ні на адно з іх толкам не мог адказаць.

— Рэжа, так?—перш за ўсё запытаўся Жэня і, будучы зусім перакананы ў гэтым, самаадзейна ўсміхнуўся. Атрымаўшы аднаўны адказ, ён ступаваўся, не ведаючы як быць: шкадаваць ці радавацца.

Жэня сёння незвычайна адносіўся да таварышаў, асабліва да тых, хто паспяхова здаваў экзамены. Ён разам з усімі віншаваў іх, паціскаў ім рукі, але ў яго душы нараджаліся дзіўныя пачуцці. Ці зайздрасць яго мучыла, ці проста пагарда да «зубрылаў»—Жэня не мог зразумець. Ён сіліўся, змагаўся з дрэнным душэўным настроем, але нейкая трывога астрыём упівалася ў сэрца.

Жэня хадзіў па калідоры, адасабляўся, раскрываў падручнік, выкрэсліваў ужо выцягнутыя пытанні, курыў і зноў хадзіў...

Мінула яшчэ колькі часу. Прыйшла чарга Жэні. Аляксей Сцяпанавіч узяў яго заліковую кніжку і прапанаваў цягнуць білет. С тайнай баязлівасцю Жэня прабег вачыма пытанні: бледныя губы яго задрыжэлі, закалаціліся калені—ён выцягнуў тое, чаго больш за ўсё не хацеў. Зрэшты, так здавалася Жэню. У даны момант ён і сам добра не ведаў, што б хацеў выцягнуць.

НА ЗДЫМКУ: Студэнтка III курса біяфака, сакратар камсамольскай арганізацыі свайго курса Галіна Душкевіч.

АГЛЯД ДРУКУ

Сакрэт біёлагаў

ХТО ВЫПУСКАЕ насценгазету на біялагічным факультэце: мо' кваліфікаваныя журналісты? Не, звычайная рэдкалегія на чале са студэнтамі М. Гесем і У. Міхалковічам. Партыйна-камсамольскі і прафсаюзны орган «За мічурынскую біялогію» вабіць да сябе прыгажосцю мастацкага афармлення, навізной, шматграннасцю, глыбокай змястоўнасцю змешчаных матэрыялаў. У апошнім нумары (ад 26 красавіка г. г.) больш дваццаці заметак, і кожная з іх мае цікавую, часам нечаканую форму падачы фактаў. Тут удала выкарыстаны многія літаратурныя і газетныя жанры. Побач са справаздачнай карэспандэнцыяй аб рабоце XVI студэнцкай навуковай канферэнцыі біяфака—прачуленыя пажаданні прафесараў і выкладчыкаў пяцікурснікам-выпускнікам на дарогу, побач з крытыкай у адрас нядобрасумленных студэнтаў, якія часта прапускаюць заняткі і дрэнна вучацца, — матэрыялы аб творчай працы дыпломнікаў. Замалёўка аб старэйшым работніку факультэта прэпаратару А. К. Цітку і студэнцкія вершы. З. Сіцько надаюць насценгазеце своеасаблівую прывабнасць і цеплыню.

Няма неабходнасці пералічваць усю тэматыку і прыёмы яе адлюстравання на старонках «За мічурынскую біялогію». Падкрэслім яшчэ раз адну з самых істотных рыс гэтай газеты—нагляднасць. Мініятурныя фотарэпартажы, малюнкі, рубрыкі яшчэ больш паглыбляюць тэкст заметак.

У чым жа сакрэт таго, што біёлагі выпускаюць такую багатую, энцыклапедычную насценгазету? Рэдактар яе М. Гесь адкрыў нам сакрэт—выпускае «За мічурынскую біялогію» не толькі здольная і дружная рэдкалегія, але і шматлікія карэспандэнты.

Паглядзім, што цікавага ёсць у апошніх нумарах іншых насценгазет.

«Решим любую задачу» (фізічны факультэт) заметкай студэнткі 4-га курса В. Крукоўскай паведамляе, што першыя ўрокі, дадзеныя студэнтамі-практыкантамі ў школе № 46, атрымалі ацэнку «выдатна». Але поспехам студэнтаў у вучобе супроцьпастаўляюцца некаторыя абставіны жыцця ў інтэрнаце. А іменна, з заметкі студэнткі Ф. Брудно (4 курс), бачым, што фіззарадку любяць яшчэ не ўсе фізікі і, на наш погляд, насценгазета факультэта з такой усемагутнай назвай павінна дапамагчы рашыць канкрэтную задачу—арганізавана выконваць загад рэктара.

Прыгожа выглядае майскі нумар «Савецкага юрыста». Чытаючы перадавіцу, заметку Т. Мароза, радуемся дружнай працы студэнтаў юрфака на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта. Але дачытаўшы яе да канца, уснамі аўтара хочацца зрабіць папрок у адрас камсамольскага бюро юрфака, якое слаба ўздзейнічае на гультаёў-беларучак Шкрабо, Ільюк, якія фізічную працу для сябе лічаць заганнай справай.

Студэнты А. Тарасенка і В. Самусёў пішуць, што на юрыдычным факультэце некаторыя маладыя людзі, вывучаючы законы дзяржавы, правы савецкіх грамадзян, у той жа час забываюць аб сваіх абавязках і нормах сацыялістычнай маралі. Гэта найбольш яскрава відаць (паводле слоў аўтараў заметкі) на паводзінах распусніка Тапарашава, які ў рэстаран дарогу ведае сам, а з рэстарана яго выводзіць міліцыя.

«Студэнт гістфака» змяшчае матэрыялы аб узросшай актыўнасці студэнтаў у вучобе і грамадскім жыцці. Студэнт Малінін піша аб спартыўных справах на факультэце, аб перамозе гісторыкаў ва універсітэцкім кросе.

Пра абаронную работу арганізацыі ДТСААФ паведамляе тав. Ханчын.

Не забыла рэдкалегія і пра сваіх дыпломнікаў. Тав. Конан у невялікай заметцы расказвае аб выдатнай абароне дыпломнай работы выпускніцай Э. Маковіч. Падабаецца такая газета, бо яна адлюстроўвае імклівае наступленне ў вучобе і актыўную, выдатную абарону на важнейшых пазіцыях навукі—экзаменах.

У майскім нумары «Слова філолага» вялікую плошчу (амаль трэць) адводзіць артыкулу аб «Выніках навуковых работ кафедраў» філфака. Затое другіх, надзённых матэрыялаў менш. З боку тэхнічнага выканання нічога новага і тым больш цікавага рэдкалегія не вынайшла: калонкі шырачэзныя, заметкі аб'ёмістыя, фотаздымкі малацікавыя. Адразу прыкметна, што нумар зроблены наспех.

Заўважым, што ў гэтым нумары дарэчы змешчаны выказванні работнікаў рэспубліканскіх газет В. Я. Тараса («Звязда»), Р. Самусенкавай («Чырвоная змена») аб тым, што факультэту (у тым ліку і аддзяленню журналістыкі трэба быць бліжэй да жыцця. На наш погляд, у першых шэрагах за ажыўленне «Слова філолага» павінна быць рэдкалегія насценгазеты, а ў авангардзе—журналісты: каму ж, калі не ім, рабіць цікавую, узорную газету? Няхай выбачае рэдкалегія на чале з Д. Фактаровічам, але па заслугах крытыкуе яе сатырычны дадатак да «Слова філолага»—«Джала». Апошні жыве яшчэ нямнога, але ўжо зарэкамендаваў сябе як востры, дзейсны орган камсамольскага бюро факультэта.

П. КРЫВАНОЖАНКА.

КАНФЕРЭНЦЫЯ СНТ

У аўдыторыі ціха... Усе ўважліва слухаюць дакладчыка, многія штосьці запісваюць у сшыткі.

Такія малюнкі можна было часта назіраць у аўдыторыях універсітэта ў перадмайскія дні. Цэлую нядзелю працягвалася навуковая студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная рашэнням XXI з'езда КПСС і вынікам навуковай работы студэнтаў за 1958—59 навучальны год. На канферэнцыі прысутнічала многа гасцей — студэнтаў з ВНУ многіх гарадоў краіны: Масквы, Ленінграда, Харкава, Горкага, Вільнюса, Ужгарада і іншых.

У час канферэнцыі працавала 11 навуковых секцый. На іх было прачытана 113 лекцый і дакладаў на самыя разнастайныя тэмы, што сведчыць аб шырокім дыяпазоне навуковых студэнтаў. Большасць з іх многа і сур'ёзна папрацавалі над сваімі дакладамі. Найлепш падрыхтаваным аказаўся біялагічны факультэт (старшыя СНТ тав. Л. Шкляроў).

Гэта дало станоўчыя вынікі. На пасяджэннях прысутнічала па 100—120 чалавек, у тым ліку многа гасцей. Усяго на факультэце было прачытана 11 дакладаў. Многія з іх маюць вялікую цікавасць. Вельмі змястоўнымі былі даклады студэнтак III курса Э. Шушкінай і Г. Нечань на тэму «Некаторыя даныя па дынаміцы размнажання і развіцця тынаў планктонных ракападобных (навуковы кіраўнік — дацэнт П. Пятровіч), студэнткі 4 курса Гасўскай «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» У. І. Леніна і некаторыя філасофскія пытанні біялогіі (навуковы кіраўнік —дацэнт А. Ляўко), студэнткі гэтага ж курса т. Карабанавай і многіх іншых.

Добра прайшла канферэнцыя на геаграфічным факультэце. Тут было прачытана таксама 11 дакладаў. Найбольшай увагі заслугоўваў даклад студэнткі 4 курса Д. Цвірко на тэму «Насельніцтва Глыбоцкага раёна Маладзечанскай вобласці» (навуковы кіраўнік — дацэнт Н. М. Раманоўскі). У жывой і цікавай форме дзяўчына расказала аб жыцці раёна да рэвалюцыі, аб росце яго ў гады савецкай улады. Свой даклад Цвірко паясніла многімі наглядными дапаможнікамі, схемамі, яскравымі прыкладамі.

Цікавыя даклады былі прачытаны на юрыдычным факультэце: «Утварэнне БССР і першы этап яго дзяржаўнага будаўніцтва» (дакладчык — студэнт II курса І. Шаўчэнка), на фізфаку: «Пераўтварэнне свету сістэмай многіх часціц» (дакладчык—студэнт V курса Г. Круглік), на філфаку: «Антымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага» (дакладчык — студэнт III курса В. Янкоўскі) і на іншых факультэтах.

Госці выступілі таксама са сваімі дакладамі. У сваю чаргу нашы студэнты пабывалі на навуковых канферэнцыях многіх ВНУ братніх рэспублік.

Нельга сказаць, што на канферэнцыі не было недахопаў. Дрэнна падрыхтаваліся да яе філалагічны і юрыдычны факультэты.

Старшыні СНТ факультэтаў малі клапаціліся аб тым, каб пасяджэнні секцый арганізаваць больш цікава і карысна. Так, напрыклад, на пасяджэннях філолагаў прысутнічала ўсяго 30—40 чалавек.

М. ШЫМАНСКІ.

Піянерважатая

ПА ВУЛІЦЫ Грушаўскага пасёлка невялікімі групкамі ў апошні час ходзяць хлопчыкі і дзяўчынкі з тачкамі. Не прапускаюць яны ніводнага двара, ніводнага куточка, дапытліва пытаюць кожнага гаспадара ці гаспадыню:

— У вас ёсць металалом?

Школьнікаў 14 сярэдняй рускай школы зараз ахапіў адзіны подых: сабраць як мага больш металалому. Нікому ж няма ахвоты ехаць на чарапасе. У школьным жа калідоры вісіць спецыяльная дошка паказчыкаў: хто ідзе наперадзе ў зборы металалому, той ляціць на ракеце, другі—на самалёце і г. д.

І вось вынік—за 2—3 тыдні 14 школа сабрала каля 20 тон лому. Але старшая піянерважатая Іна Русаловіч не зусім задаволеная. На першым жа месцы аказаўся 9 клас, а піянеры 4-га «В» на другім!

У апошнія дні ў Іны было асабліва багата работы. Ідзе прыём самых малодшых школьнікаў у акцябраты, а акцябрат у піянерскую арганізацыю імя Леніна. І трэба было бачыць, як свяціліся вочы ва ўсіх—і ў тых, каго прымалі і ў тых, хто прымаў!

Час-ад-часу Іна арганізоўвае культпаходы школьнікаў у кіно, тэатры, экскурсіі. У ленінскія дні каля трохсот малодшых школьнікаў прагледзелі ў кінатэатры «Авангард» фільм «Праўда», прысвечаны Уладзіміру Ільічу Леніну.

Вялікую дапамогу ў піянерскай рабоце аказваюць ёй настаўнікі школы, асабліва дырэктар школы Вітольд Феліксавіч Ячэйка і загадчык вучэбнай часткі Мікалай Макаравіч Крук. Яны заўсёды цікавяцца, як ідуць піянерскія справы, у чым трэба—дапамагаюць, падказваюць.

Але і сярод школьнікаў у Іны многа памагатых. Вось, напрыклад, маленькая Света Чвялёва малюе і піша кожны нумар насценнай газеты піянерскай арганізацыі «Голас дружыны». А ў газеце школьнікі пішуць аб тым, як цікава прайшоў збор, прысвечаны А. Ф. Мяснікову, як хто разумее сяброўства і таварыства паміж хлопчыкамі і дзяўчынкамі. На адным са збораў было ўсім весела, бо ён абмяркоўваў вельмі цікавую тэму: хто што можа рабіць—шыць, вышываць, гладзіць, гатаваць страву і г. д. А цяпер вось прапануюць арганізаваць піянерскі патруль на Грушаўскім пасёлку.

А ў Іны Русаловіч ёсць яшчэ адна справа—яна вучыцца на III курсе матэматычнага аддзялення завочнага факультэта БДУ. Тут таксама не зусім лёгка знайсці час. Але Іна ўсё паспявае.

Я. ЛЯХАЎ.

Нідзе не падзенешся.

— Не зарвемся, дык прарвемся,—мільганула думка ў галаве Жэні. Ён сеў за стол. Тут Жэня ўжыў усе намаганні, праявіў усе свае «здольнасці». Сабраўшыся з духам, ён дрыжачым, гучным голасам пачаў адказваць. Выпаліўшы некалькі пышных уступных сказаў, Жэня выдыхнуўся. Думкі, словы, прадметы блыталіся ў яго галаве, ад чаго яшчэ больш павялічвалася яго баязлівасць, і Жэня працягваў бязладна, часам зусім неўпапад і нарэшце змоўк.

— Далей,—спакойна сказаў Аляксей Сцяпанавіч.

Жэня пільна ўглядаўся ў гальштук Аляксея Сцяпанавіча, моршчыў лоб, жмурыў вочы, рабіў незадаволены выраз твару. Гледзячы на яго, можна было падумаць, што нейкая глыбокая думка вандруе ў яго галаве, і вось—вось ён схоніцца за ле.

— У мяне вялікае... У мяне... час... Я не мог...,—хацеў было прамовіць зусім разгубіўшыся Жэня і нагаварыў бы, мусіць, яшчэ кучу нязвязных слоў, але ў гэты час Аляксей Сцяпанавіч сказаў:

— Добра. Скажыце, якія групы шрыфтоў вы ведаеце?

— Ну-у-у. Я ведаю наступныя групы: егіпецкая, акадэмічная, новая газетная... і... і...,—Жэня памаўчаў і дадаў,—і старажытная плакатная.

— Што ж, прыдзецца падвучыць.

— Я ведаю...Толькі вы...вы яшчэ запытайце.

Аляксей Сцяпанавіч задаў яшчэ два пытанні і не атрымаў ніводнага выразнага адказу. Дзверы рэзка расчыніліся, і Жэню абступілі таварышы.

— Панёс! Я ж казаў, што рэжа.

— Як так? Што папала?—у адзін голас запыталіся сябры.

— Ён спытаў у мяне групы шрыфтоў. Я пераблытаў групы і гарнітуры. Потым... потым... па шчыльнасці шрыфты бываюць вузкія, шырокія. Я памыліўся і дадаў светлыя. Потым нечакана замест вёрсткі пачаў расказваць макет. Астатняе я ўсё ведаў.

— Вось ужо не хлусі. Толькі што казаў «нічога не ведаю».

—Каза-а-аў, каза-а-аў, — перакрывіў Жэня і нервова дадаў: —Галоўнае ў чалавеку—гэта сціпласць. Я ўсю ноч займаўся. Я... я... Я пайду да дэкана,—амаль пракрычаў Жэня і хутка спусціўся ўніз па лесвіцы.

— Куды? Ты ж сам вінаваты,—абурыліся аднакурснікі, але Жэня не слухаў.

— Калейдаскоп, — данеслася да вушэй Жэні, калі ён трымаўся за ручку дзвярэй прафесарскай.

Э. КАНДЗЕРСКІ.

Джазавае кацянё

На конкурс

Фельетон

ГЭТА БЫЛО рыжае памаўзлівае кацянё. Настолькі памаўзлівае, што гаспадары нават забылися на імя Рыжык, дадзенае яму пры нараджэнні, і называлі няйначай, як Памаўза. У Памаўзы быў тонкі музыкальных слых. І не дзіва. Бацькі яго былі музыканты. Маці Мурка па праву лічылася першай скрыпкай у кацячым аркестры, бацька, тоўсты вусаты кот Васька, распуснік і п'яніца, нярэдка дырыжыраваў на канцэртах, якія начамі наладжвалі каты на дахах дамоў.

Сэрца Памаўзы гатова было разарвацца ад захаплення, калі ён слухаў такі кацячы аркестр. Але аднойчы рыжае кацянё, прагульваючыся па карнізу аднаго з дамоў, пачула такую музыку, што ...што больш і не хацела слухаць ігру бацькоў. Даўно пракруцілася пласцінка, а кацянё ўсё сядзела і чакала, што можа зноў пачуюцца чароўныя гукі «Ніагарскага вадапада». І не ведаў Памаўза, што на зямлі ў яго ёсць аднадумца і паслядоўнік...

Зала аднаго з рэстаранаў горада Мінска. Іграе музыка, за сталом наведвальнікі. Звон стаканаў, стомленыя рухі афіцыянтак. Нечакана высокі, стройны юнак, стыльна апрануты, злёгку падвыпіўшы, падышоў да музыкантаў і патрабаваў: «Сыграйце апошнюю навінку джазавай музыкі «Ніагарскі вадапад». Аркестранты здзівілена пацяснулі плячыма. «Як, не ведаць такой папулярнай рэчы?»—і ён нагардліва сціснуў зубы, рэзка павярнуўся і стаў патрабаваць кнігу скаргаў. Яму прынеслі. Юнак пачаў пісаць... У канцы дабавіў подпісь: Хрыпакоў.

Дзіўна, ва універсітэце ён вядомы пад другім прозвішчам. Гэта студэнт 4 курса юрыдычнага факультэта Юры Тапарашаў, кіраўнік факультэцкага «джаз-аркестра», апошні магікан «залатой моладзі».

Бачыце ж, яму надакучыла жыць на гэтым свеце. «Як не абурацца,—гаворыць ён,—калі ў рэстаране іграюць музыканты, якія ўвесь дзень ходзяць за дамавінамі, а вечарамі весяляць публіку».

Але каленца, якое ён выкінуў у рэстаране, гэта дробязь у параўнанні з тым, якое выкінуў нядаўна. Яму прышло ў галаву падзяліцца сваімі «узвышанымі» думкамі і прапець хвалебныя дыфірамбы аднаму з каралёў амерыканскага джазу. З гэтай мэтай ён напісаў пісьмо, якое з'явілася прадметам абмеркавання на камсамольскім сходзе.

І вось ён на трыбуне. З лёгкай «іроніяй» чытае сваё пісьмо і каментыруе. «Я пісаў гэта пісьмо не каралю амерыканскага джазу, як сказаў у сваім дакладзе дэкан таварыш Семярыхін, а гіганту джазу».

Далей прамоўца працягваў: «Як тут дэкан заявіў, што пісьмо напісана ў развязным тоне і зусім недапушчальна для савецкага студэнта. Я адкажу—што тут такога развязнага ў маіх словах? Я прадстаўляюся ў пісьме гіганту джазу словамі, што я адзін з радавых прадстаўнікоў атрады джазавых кацяняў, што я ў Беларусі з цяжкасцю знаходжу запісы яго музыкі».

Гісторыя з Памаўзой мела больш-менш шчаслівы канец, хоць быў час, калі кацянё было недалёка ад вар'яцтва. Яно навет перастала хадзіць за грошы бацькоў у рэстараны, а ўсё сядзела на карнізе і чакала, чакала, пакуль паставяць на радыёлу «Ніагарскі вадапад».

Кот Васька, хоць і быў распуснік і п'яніца, заставаўся нядрэнным бацькам. І калі ён даведаўся аб захапленні Памаўзы, то падкаравуліў сыночка на знаёмым карнізе і так адцягаў за хвост і вушы, што ў таго пры адным успаміне аб «Ніагарскім вадападзе» шэрсць дыбам устала.

Цікава, а ці здолеюць камсамольцы юрфака вылячыць Тапарашава?

В. КУНЕВІЧ.

У БЛАКІТ УЗНІМАЮЦЦА...

(Заканчэнне. Пачатак на стр. 1, 2)

А вось сам брыгадзір Генадзь Лаўрыновіч за працай. Міжволі залюбуешся, як паслухмяна ў яго руках кладуцца цагліны на вызначанае месца. Працуе ён пакуль што на вышыні дрэў ва універсітэцкім скверыку, але не засмучаны гэтым. З правага боку ад яго зорачкі электразваркі пабліскваюць аж на 4 паверсе. Ведае Генадзь, што пройдзе час,—і далёка ўнізе пад ім будуць шумець універсітэцкія дрэвы, бо з кожным днём узнімаюцца ў блакіт сцены будучага беларускага палаца навукі.

А. ГАРЭЗНЫ.

МЯЧ НАД СЕТКАЙ...

БЕЛЫ ПЛАСТМАСАВЫ шарык ледзь адскочыў ад зялёнай паверхні стала і, пасланы моцнай рукой, вярнуўся назад. Яшчэ секунду—і ён вернецца да паслаўшага яго. Той моцна б'е,—шарык у палёце «чыркае» за вугал, адлятае ад сцяны. Ачко выйграна.

Вы яшчэ толькі падымаецеся на другі паверх гуманітарнага корпуса, як чуеце характэрнае пастукванне. Гэта гуляюць аматары настольнага тэнісу... Вельмі хочацца пачаць здалёк. Пасля першынства вышэйшых навучальных устаноў горада Мінска 1958 года, у якім каманда нашага універсітэта падзяліла 5—6 месцы з інстытутам замежных моў, некаторыя ігракі каманды цвёрда рашылі ўкараніць ва універсітэце настольны тэніс, зрабіць яго поўнапраўным відам спорту. Іх было мала — 6—7 чалавек: Салееў, Кожур, Гараеў, Станішэўскі, Салдатаў і іншыя. Усё, здавалася, абярнулася супраць энтузіястаў—і адзіны разваліўшыйся стол, і тое, што не было дзе гуляць, і старыя пашарпаныя ракеткі, і сетка, зацыраваная тоўстай і моцнай чорнай ніткай. І усё ж нерамаглі яны—энтузіясты. Жывая, даступная амаль кожнаму, цікавая гульня прыцягвала ўсё больш і больш аматараў. І яны дабіліся таго, што кафедра фізвыхавання закупіла ракеткі, цэлулоідныя шарыкі. Больш вопытныя вучылі сваіх таварышоў, якія ўпершыню сталі з маленькай ракеткай у руках. І вось нядаўна закончылася асабістае першынства БДУ па настольнаму тэнісу.

Дарэчы, падрабязней аб першынстве. У барацьбе за званне чэмпіёна ўдзельнічала 20 чалавек. Усе ўдзельнікі былі разбіты на дзве падгрупы па 10 чалавек у кожнай.

У палажэнні аб чэмпіянаце гаварылася, што першыя тры прызёры выходзяць у фінал, дзе працягваюць барацьбу за 1—6 месцы. Ігракі, заняўшыя 4—5 месцы ў падгрупах, ствараюць—«сцяшальную» фінальную групу—яны аспрэчваюць месцы з 7 па 10. У першай падгрупе, у якой па волі жарабя аказалася многа моцных канкурэнтаў, кожны матч праходзіў востра і захапляюча, кожны матч мог зрабіць рапаючы ўплыў на канчатковы вынік барацьбы. Так Вінаградаў прайграў Васілюку, але выйграў у Сасімовіча, Васілюк перамог 4 удзельнікаў запар, але прайграў Кірылліну. Кірылін, у сваю чаргу, пацярпеў паражэнне ад Сасімовіча. Калі ў гэтай падгрупе заставалася зыграць па адной сустрэчы, найбольшыя шансы трапіць у фінал меў Кірылін, але нечакана прайграўшы Барысевічу, ён аказаўся не ў ліку прызёраў і вымушан быў задаволіцца 4 месцам. 5 месца ў падгрупе заняў мінулагодні чэмпіён І. Станішэўскі. У фінал «А» увайшлі ад І падгрупы Сасімовіч (які меў адно паражэнне), Вінаградаў і Васілюк (на два паражэнні). У ІІ падгрупе барацьба была больш спакойнай—тут з самага пачатку лідзіравалі Салееў (без паражэнняў) і Кавун (адно паражэнне). Затое напружаная барацьба за 3 месца разгарнулася паміж Кобляй і Жэнчакам. Перамогшы ў рашаючай партыі з перавагай на два ачкі Кобля выйшаў на 3-месца і ў фінал.

У фінале перамог Сасімовіч, другое месца заняў Салееў, далей ідуць Кавун, Васілюк, Кобля, Вінаградаў.

Але гэта статыстыка. Цяпер жа пастараемся прааналізаваць вынікі чэмпіяната. Першае месца заняў М. Сасімовіч. Але ці не выпадковай была яго перамога? Некаторыя знаўцы сцвярджаюць, што, як паказваюць вынікі папярэдніх гульняў і гульні пасля чэмпіяната, Сасімовіч гуляе не лепш а нават слабей другіх фіналістаў. Гэтыя ж знаўцы па-рознаму тлумачаць прычыны яго трыумфа, нават дрэнным настроем Салеева ў рашаючай гульні з Сасімовічам, адсутнасцю формы Васілюка.

Ну, а хто ж тады павінен быць чэмпіёнам? Большасць называе Салеева, другое месца аддаюць Васілюку, трэцяе—Кавуну. Што ж, магчыма яны маюць рацыю? Сасімовіч жа уступае Васілюку ў тэхніцы, Салееву ж і ў тэхніцы і ў тактыцы. Ён не валодае такім моцным нападаючым ударам, як Кавун. Але спорт ёсць спорт, і перамагаюць у ім часцей за ўсё найбольш валявыя спартсмены, якія ўмеюць «выкладацца» ў час гульні без астатку, якія ўмеюць мабілізаваць усе свае сілы для перамогі. Праўда, часам гэтага бывае недастаткова. Таму Сасімовічу варта настойліва трэніравацца, вучыцца гуляць тэхнічна, пераймаць усё лепшае, што ёсць у гульні таварышоў па камандзе: Салеева, Васілюка і іншых. І, галоўнае, не зазнавацца.

У апошні час зборная каманда універсітэта інтэнсіўна рыхтуецца да першынства вышэйшых навучальных устаноў горада Мінска, якое павінна адбыцца ў маі—чэрвені гэтага года. Створан «трэнерскі» Савет. Старшым трэнерам на грамадскіх пачатках назначаны В. Салееў, трэнерам У. Васілюк. Рыхтуюцца да першынства і капітан М. Сасімовіч і яго памеснік—Э. Кожар. Нядаўна зборная універсітэта правяла 2 кантрольныя гульні з камандамі заводаў імя Варашылава і інструментальнага. Абедзве сустрэчы былі выйграны: першая з лікам 5:1 другая—6:0.

В. АЛЯКСЕЕЎ.

У СТУДЭНЦКІХ ІНТЭРНАТАХ

ПАРАДАК І ЧЫСЦІНЯ пакояў, дзе праводзяць студэнты свой адпачынак, дзе часам рыхтуюцца да заняткаў, залежыць ад іх саміх, ад таго, як яны будуць змагацца за гэту чысціню. Відавочна, што акуратнасць быта студэнтаў, знешні выгляд іх пакояў у значнай меры гаворыць і аб культуры іх жыхароў.

Праведзены да Першага мая агляд на лепшы інтэрнат універсітэта паказаў, як самаабслугоўванне адбіваецца на быце студэнтаў. Конкурс паказаў, што значна палепшыўся санітарны стан пакояў, што практыка самаабслугоўвання прывівае маладым людзям культурныя навыкі, прымушае цаніць працу. Па праву першае месца ў аглядзе было прысуджана інтэрнату № 2 (старшыня студсавета Шарамецьеў).

У гэтым інтэрнаце большасць жыхароў—дзяўчаты. Агульнавядома, што пакоі ў дзяўчат заўсёды лепшыя, чым у хлопцаў. Пацвярджэннем гэтага могуць служыць пакоі дзяўчат у інтэрнаце № 2. У ім не толькі падтрымліваецца добры парадак, але праводзіцца вялікая выхаваўчая работа. Выпускаюцца насценныя газеты, нярэдка бываюць гутаркі, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці.

Апошнія праверкі паказалі, што значна палепшыўся парадак і ў інтэрнаце № 3 (корпус «Б»). Цяпер фізікі і матэматыкі, якія тут жывуць, смела могуць спаборнічаць з жыхарамі інтэрната філолагаў.

Пройдземся па другіх інтэрнатах і паглядзім, як студэнты наладжваюць культурны быт у сваіх пакоях.

Вось пакой № 7 у інтэрнаце па вуліцы Кірава. Тут утульна і акуратна. На вокнах чыстыя фіранкі, на стале новы абрус, стаіць графін з вадой, пепельніца, на сценах рэпрадукцыі з карцін. Койкі з салдацкай запраўкай. Самі рэбяты—першакурснікі юрфака Іван Бурак, Уладзімір Бань, Сямён Халецкі, Іосіф Дзямідаў — былыя воіны, прышлі ва універсітэт з вытворчасці, прайшоўшы добрую «школу жыцця». Рэбяты могуць з густам прыбраць пакой, не церпяць неахайнасці. І не здарма яны атрымалі прэмію—зеркала.

Прыемна зайсці ў пакой № 23. Жыхары пакою, на чале з старастам Міхаілам Вішняковым, утрымліваюць пакой у чыстаце і акуратнасці.

Пажадаем жыхарам інтэрната далейшых поспехаў у наладжванні культурнага быту.

Ф. КАМОЗА, старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома.
А. ЛЯПІЧ.

НА ЗДЫМКУ: (уверсе) дзяжурная па інтэрнату С. Вайнічэнка пільна сочыць за парадкам.

НАШ КАЛЯНДАР

П'ЕР КЮРЫ

15 мая гэтага года спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння выдатнага французскага вучонага і хіміка П'ера Кюры.

Ён нарадзіўся ў Парыжы ў сям'і ўрача. Яшчэ ў дзяцінстве ён стаў сведкай нараджэння і гібелі Парыжскай Камуны, светлую памяць аб якой ён захаваў на ўсё жыццё. Ужо ў раннія гады П'ер праявіў вялікія здольнасці да матэматыкі і фізікі. З 19 гадоў—ён асістэнт Парыжскага універсітэта. З 1883 года і на працягу наступных 22 гадоў ён з'яўляецца спачатку выкладчыкам, а затым прафесарам Вышэйшай тэхнічнай фізіка-матэматычнай школы Парыжа. Дарога на універсітэцкую кафедру для яго, як не закончыўшага якой-небудзь вышэйшай навучальнай установы ў Францыі, была закрыта. І толькі ў 1905 годзе, калі навуковыя заслугі супругаў Кюры прызнаў увесь свет, П'еру Кюры было прапанавана месца прафесара ў Сарбоне. Адначасова ён быў абраны членам Парыжскай Акадэміі Навук.

Геніяльны вучоны да канца свайго жыцця не меў у сваім распараджэнні фізічнай лабараторыі. Усе свае адкрыцці ён зрабіў у падсобных памяшканнях, аж да праходу паміж лесвіцай і аўдыторыяй для студэнтаў і старога хлева.

Яшчэ ў 1880 годзе, даследуючы крысталы, ён разам з сваім братам адкрыў так званыя п'езаэлектрычныя з'явы. Гэтыя ўласцівасці крысталаў зараз шырока выкарыстоўваюцца ў радыётэхніцы і радыёфізіцы.

Марыя Складоўская, якая стала ў 1895 годзе жонкай П'ера Кюры, разам з ім пайшла па цяжкім шляху нявырашаных навукай пытанняў.

Чаму ўранавыя руды выпускаюць прамені? Магчыма, у іх ёсць невядомыя элементы? І вось у 1898 годзе яны паведамляюць аб адкрыцці палонія і радыя — двух новых элементаў.

Каб пераканацца ва ўсёпранікаючай здольнасці радыя, П'ер Кюры падвергнуў сваю руку 10-гадзіннаму абпраменьванню. Ад гэтага ўтварылася рана, якую давялося лячыць 4 месяцы. Самым галоўным з'явілася адкрыццё ў 1903 годзе таго, што радый выдзяляе значную колькасць энергіі. Кюры выказаў геніяльную гіпотэзу, што гэта ўнутрыатамная энергія. Яшчэ тады ён сказаў: **«...у злачынных руках радый можа зрабіцца крайне небяспечным».**

Даследаванні П. і М. Кюры па радыяактыўнасці былі ўдастоены ў 1903 годзе Нобелеўскай прэміі па фізіцы, якую яны атрымалі разам з прафесарам Беккерэлем.

Наперадзе было яшчэ шмат работы. Але трагічны выпадак (ламавы воз раздавіў П'ера Кюры) вырваў яго з жыцця. Памяць аб ім ушаноўвае ўвесь свет.

М. БАНДАРЭНКА.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ

АТ 03157 Зак. 683 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.